1. Выдзелі агульны зычны гук і запішы яго.
Таран, парад, кот –
Суп, поле, рыбка –
Казка, воз, газ –
Рог, смех, ход –

2. Падбяры да прыметніка антонім.
Свежы хлеб –
Свежыя агуркі –
Свежая думка –
Свежая раніца –

3. Устаў замест кропак суфіксы.

Малыя вуж…ы з’яўляюцца на свет з дроб…ных, падобных на птуш…ыя, яек. Іх адкладвае вуж…ха ў лет…юю ліст…у ці мяккі вільгот…ы мох на сон..ым, угр…ым месцы.

4. Перакладзі словазлучэнні з рускай мовы на беларускую і абазнач род назоўнікаў.

Серый гусь, золотая медаль, белая скатерть, большой зал, австралийский кенгуру.

5. Запішы словы ў дужках у патрэбнай па сэнсе форме. Вызначы склон назоўнікаў.

Скакаць па (поле), прыехаць (ноч), думаць аб (муха), ганарыцца (Коля), ісці па (снег).

6. Замяні дзеясловы цяперашняга і будучага часу дзеясловамі неазначальнай формы.
Магу -
пяку -
прылягу -
падстрыгу -

7. Замяні словы і іх спалучэнні фразеалагізмамі.
Нечакана, раптоўна –
Добра працаваць –
Мала –

8. Дапішы канец прыказкі.
Не можаш памагчы, дык……
Лішняе гаварыць – толькі …..
Не хваліся пачаткам, а……

9. Разгадай анаграму.
Сінонім ты знайдз журбе.
Ды прачытай наадварот –
І ежа выявіць сябе,
На смак не горшая, як мёд.

10. Злучы аўтара з яго творам.
Ніл Гілевіч “Пчала і Ружа”
Васіль Жуковіч “Калі рана ўстанеш”
Уладзімір Корбан “Першая настаўніца”

Адказы:
1. [т], [п], [с], [х].
2. Чэрствы хлеб.
Засоленыя агуркі.
Шаблонная думка.
Цёплая раніца.
3. –анят-, -н-, -ын-, -ых-, -ашн-, -от-, -н-, -ечн-, -эт-.
4. Шэрая гусь (ж.р), залаты медаль (м.р.), белы абрус (м.р.), вялікая зала (ж.р.), аўстралійскі кенгуру (м.р.).

5. Скакаць па полі, прыехаць ноччу, думаць аб мусе, ганарыцца Колем, ісці па снезе.

6. Магчы, пячы, прылегчы, падстрыгчы.

7. Як снег на галаву, не пакладаючы рук, як кот наплакаў.

8. Не можаш памагчы, дык лепш памаўчы.
Лішняе гаварыць – толькі справе шкодзіць.
Не хваліся пачаткам, а хваліся канчаткам.

9. Сум-мус.

10. Ніл Гілевіч “Калі рана ўстанеш”
Васіль Жуковіч “Першая настаўніца”
Уладзімір Корбан “Пчала і Ружа”